ТВОРЧАСЦЬ

# Вечар віншаванак

**Прэзентацыя кнігі «Віншаванкі» вядомага на Гродзеншчыне кампазітара, фалькларыста, паэта Яўгена Петрашэвіча адбылася ў абласной навуковай бібліятэцы імя Яўхіма Карскага.**

У новым зборніку некалькі раздзелаў: прысвячэнні радні, музыкам, паэтам, мастакам, артыстам, народным творцам, сябрам і сяброўкам, творчым калектывам, з якімі Яўген Канстанцінавіч шмат гадоў супрацоўнічае. Прадмову напісаў сябра аўтара паэт Міхась Губернатараў. Прыгожа аформіў, уклаў і выдаў кнігу ў сваім выдавецтве «ЮрСаПрынт» Аляксандр Рыжы.

Усе, хто прыйшоў на вечар, атрымалі падарунак – кнігу «Віншаванкі». Прысутныя не засталіся ў даўгу, адказаўшы Яўгену Петрашэвічу добрымі словамі падзякі, цёплымі ўспамінамі пра супрацоўніцтва і вершамі, прысвечанымі таленавітаму самародку, аўтару вялікага набытку: трох кніг вершаў, вялікай колькасці зборнікаў песень, харавых твораў, музычных балад.

**Людміла КЕБІЧ**